4. *Чижиков, В. М.* Новые подходы к технологиям менеджмента социально-культурной деятельности / В. М. Чижиков // Культура и образование. – 2013. – № 1. – С. 73–78.

***У. А. Трапянок,***
*кандыдат мастацтвазнаўства,*
*старшы выкладчык кафедры рэжысуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў,*
*дырэктар дырэкцыі канала*
*«Культура» Беларускага радыё*

## УПЛЫЎ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ НА ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ СЛУХАЧОЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Радыё як сродак масавай інфармацыі на працягу сваёй гісторыі было і застаецца адным з магутных каналаў, здольных сфарміраваць у слухацкай аўдыторыі розныя, у тым ліку духоўныя, эстэтычныя каштоўнасці, якія напрамую звязаны з пошукам, адчуваннем прыгажосці і гармоніі, а таксама іх стварэннем. Эстэтычныя каштоўнасці ўплываюць на ўспрыманне чалавекам рэчаіснасці скрозь прызму глыбокіх, яркіх, моцных эмацыянальных перажыванняў, мноства адценняў настрояў і пачуццяў. У нашай свядомасці эстэтычныя каштоўнасці выклікаюць асацыяцыю пераважна са станоўчымі якасцямі і садзейнічаюць духоўнаму ўзвышэнню, удасканальванню чалавека, яго выхаванню як асобы з глыбокім унутраным светам.

Дзейнасць Беларускага радыё з моманту з’яўлення 15 лістапада 1925 г. была накіравана, у тым ліку, на фарміраванне эстэтычных каштоўнасцей у слухачоў розных узроставых груп. Для радыё краіны быў характэрны сінтэз розных відаў і жанраў мастацтва, дыялог культур Усходу і Захаду. Да з’яўлення ў сярэдзіне 1950-х гг. нацыянальнага тэлебачання радыё заставалася асноўным вяшчальнікам, папулярызатарам нацыянальнай і сусветнай спадчыны, здольнай узвысіць чалавека, выхаваць у ім мастацкі густ, прывіць любоў да разнастайнасці сапраўднага мастацтва, вызначыць каштоўнасныя арыенціры.

У праграмнай сетцы першага дзесяцігоддзя функцыянавання Беларускага радыё істотную пазіцыю займала ўвасабленне ў

акустычнай прасторы твораў літаратуры, што аказала вялікі ўплыў на далейшае развіццё мастацкага вяшчання і асвету слухацкай аўдыторыі. Літаральна на другі год дзейнасці ў эфіры былі зроблены спробы рэтрансляцыі тэатральных спектакляў, што паўплывала на зараджэнне нацыянальнага радыётэатра. Дарэчы, менавіта пра радыётэатр савецкі тэарэтык радыё А. Шэрэль пісаў, што «ў гісторыі культуры XX ст., бадай, няма іншага настолькі яркага прыкладу ўзаемадзеяння розных відаў мастацтва, як кантакты і канфлікты тэатра і радыё» [3, с. 18]. У аснову рэпертуарнай палітыкі беларускага радыётэатра была пакладзена нацыянальная літаратура, а таксама творы замежных аўтараў, якія гучалі на 4 дзяржаўных мовах (беларускай, рускай, польскай, ідыш). Папулярнасць беларускі радыётэатр набыў у 1930-я гг., калі з'явілася арыгінальная драматургія для радыё, а таксама засвоены жанр радыёінсцэніроўкі, які дазваляў увасобіць у радыёстудыях творы розных жанраў, аўтараў і гадоў.

На Беларускім радыё ствараліся літаратурныя радыёфільмы, радыёсерыялы, радыёкампазіцыі, у прамым эфіры арганізоўваліся літаратурныя чытанні, выступленні пісьменнікаў, трансляцыі спектакляў. Беларускім слухачам сталі даступнымі творы Я. Купалы, Я. Коласа, К. Чорнага, М. Лынькова, Э. Самуйлёнка, К. Крапівы, А. Пушкіна, М. Салтыкова-Шчадрына, М. Горкага, Д. Рыда, Б. Брэхта і інш. Інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных спрыялі радыёвечары творчасці пісьменнікаў Масквы, Ленінграда, Грузіі, Башкірыі [2]. Літаратурная рэдакцыя ў пачатку 1930-х гг. была найбольшым структурным падраздзяленнем Беларускага радыё. Адпаведна, слухач праз змест тэксту і інтанацыі выканаўцаў знаёміўся з лепшым у літаратурнай творчасці, перажываў эмоцыі герояў твораў, праецыраваў апісаныя аўтарамі сітуацыі на ўласнае жыццё.

Вяшчанне для дзіцячай аўдыторыі пачалося ў пачатку 1930-х гг. З 1931 г. у эфіры Беларускага радыё выходзіла праграма «Піянер Беларусі». Музычныя і літаратурна-драматычныя праграмы для юных слухачоў рыхтаваў дзіцячы сектар, створаны ў 1932 г. [2].

Яшчэ адзін важны мастацкі пласт асветніцкай работы – музычны – узнік на Беларускім радыё ў 1928 г. У той час быў створаны вялікі сімфанічны аркестр Беларускага радыё, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэпертуар якога ўключаліся творы айчынных кампазітараў (М. Аладава, А. Туранкова, Я. Цікоцкага, Р. Пукста, В. Залатарова, М. Чуркіна, І. Любана, П. Падкавырава), сусветных аўтараў (І. Альбеніса, М. дэ Фальі і інш.). Дапаўнялі палітру музычнага вяшчання рэтрансляцыі выступленняў хору і аркестра Беларускага дзяржаўнага тэатра. Музыка, як і літаратура, з'яўлялася важнай крыніцай мастацкага ўніверсальнага «інстытута», які ўплываў на ўзбагачэнне ўнутранага свету слухача.

Актыўнае развіццё літаратурнага і музычнага радыёвяшчання працягнулася ў пасляваенныя гады. Па радыё трансліравалася ўсё лепшае, што мелі айчынная літаратура, тэатр, мастацтва. Перад мікрафонам выступалі паэты і празаікі, гучалі вершы П. Глебкі, М. Танка, П. Панчанкі, А. Астрэйкі, Я. Коласа, у якіх паэтызавалася адбудова краіны. У агучаных празаічных творах М. Лынькова, І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, А. Кулакоўскага ўздымалася тэма гераізму і трагедыі вайны. На радыё ладзіліся абмеркаванні літаратурных твораў, што дапамагала слухачам аналізаваць, удумліва ставіцца да слова, разумець глыбіню і падтэксты твора, а таксама шанаваць гераічную гісторыю, сваіх герояў, мірнае развіццё краіны.

У музычным вяшчанні пасляваенных гадоў пераважалі класічныя шэдэўры і прэм'ерныя творы беларускіх і савецкіх кампазітараў (Р. Пукста, П. Падкавырава, У. Алоўнікава, Я. Глебава). Беларускае радыё супрацоўнічала з установамі і музычнымі калектывамі краіны – аркестрам народных інструментаў пад кіраўніцтвам І. Жыновіча, Дзяржаўнай харавой капэлай БССР пад кіраўніцтвам Р. Шырмы, Дзяржаўным народным хорам пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча і інш. [2].

Беларускае радыё працягвала займацца выхаваннем юнага пакалення слухачоў. Стварэнне перадач для гэтай катэгорыі вымагала асабліва дбайнага стаўлення да слова, музычнага афармлення, мастацкай падачы. Выкарыстоўваліся разнастайныя сродкі ўздзеяння, у тым ліку элементы гульні, забавы, фальклору. Для юнай аўдыторыі чыталіся вершы, апавяданні айчынных пісьменнікаў, арганізоўваліся канцэрты, пазнавальныя праграмы, лекцыі, праз радыё развучваліся патрыятычныя песні.

Лепшыя мастацкія праекты, створаныя ў пасляваенны час, пакладзены ў аснову радыёфонду Беларускага радыё. Сфармі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раваны ў канцы 1940-х гг., ён уключае ў сябе дзесяткі тысяч твораў айчынных і замежных кампазітараў, літаратурных і дакументальных запісаў.

Са з'яўленнем у сярэдзіне 1950-х гг. беларускага тэлевяшчання доля прысутнасці мастацкай разнастайнасці на радыё павялічылася. На найвышэйшы ўзровень развіцця з 1960-х гг. выйшаў айчынны радыётэатр. Яго пастаноўкі сталі больш дынамічнымі, эмацыянальнымі. Былі цалкам засвоены метады мантажу, якія дазволілі больш эксперыментаваць са словам, гукамі і музыкай.

Музычнае вяшчанне Беларускага радыё, паводле вынікаў сацыялагічнага апытання, у 1960-я гг. было вельмі запатрабавана айчыннай моладдзю (80 %) [2]. Адбывалася актыўнае папаўненне фондаў беларускай нацыянальнай музыкай, выкананай хорам пад кіраўніцтвам В. Роўды, інструментальным ансамблем радыё і тэлебачання пад кіраўніцтвам Л. Смялкоўскага, эстрадна-сімфанічным аркестрам Беларускага радыё пад кіраўніцтвам Б. Райскага і інш.

На фарміраванне аўдыяльнай базы, а таксама павышэнне ўзроўню культурнага выхавання і эстэтычнага ўздзеяння на слухача, вялізную ролю адыграў існуючы ў савецкі перыяд абавязковы для ўсіх савецкіх рэдакцый абмен творамі. Беларускаму слухачу сталі даступны, у прыватнасці, літаратурнадраматычныя запісы, зробленыя ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве. Значна пашырылася геаграфія музычнага вяшчання, паколькі мова музыкі вызначаецца ўніверсальнасцю ўспрымання. Радыёслухачам Беларусі сталі даступны шматлікія запісы, зробленыя, у тым ліку, у краінах Еўропы.

Для маленькіх слухачоў працягвалі выходзіць праграмы «Зорачкі», «Юныя ленінцы». Журналісты расказвалі пра важныя падзеі ў краіне, тлумачылі сэнс важных падзей, прывівалі сумленнасць, прыязнасць, любоў да вучобы, працы, творчасці. У радыёстудыі часта запрашаліся пісьменнікі, мастакі, акцёры, кампазітары. Пачаліся выпускі праграмы «Вячэрняя казка», якая не толькі прапаноўвала перад сном цікавую гісторыю, але і вучыла дзяцей смеласці, кемлівасці, дабрыні, спагадзе, любові.

Перыяд стабільнага высокамастацкага вяшчання працягваўся да пачатку 1990-х гг. Пасля распаду СССР Беларускае радыё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пайшло па шляху самастойнага, незалежнага, нацыянальна арыентаванага развіцця. Быў спынены абавязковы абмен творамі паміж радыёстанцыямі братніх рэспублік. У эфірнай прасторы Беларусі сталі з’яўляцца камерцыйныя радыёстанцыі, дзейнасць якіх падпарадкавана так званаму FM-фармату – з рэтрансляцыяй папулярнай музыкі, уключэннямі дыджэяў і кароткімі інфармацыйнымі паведамленнямі. Пачало змяняць фармат і дзяржаўнае радыёвяшчанне, колькасць станцый у складзе Беларускага радыё, здольных канкурыраваць з камерцыйным радыё, павялічылася. Нягледзячы на пашырэнне найменняў радыёхваль, аб’ёмы арыгінальнага высокамастацкага кантэнту для дзіцячай і дарослай аўдыторыі скарачаліся. Пачаў зніжацца і эстэтычны ўплыў Беларускага радыё на свайго слухача. Можна сцвярджаць, што менавіта ў 1990-я гг. стала зараджацца праблема «экалогіі» не толькі мастацкага, але і радыёвяшчання ў цэлым, пік якой прыйшоўся ў Беларусі на пачатак новага стагоддзя.

Дзякуючы рэструктурызацыі, праведзенай на Беларускім радыё ў пачатку 2000-х гг., у эфіры з’явіўся спецыялізаваны канал «Культура», місіяй якога стала папулярызацыя лепшых узораў мастацкай (найперш, музычнай і літаратурнай) спадчыны краіны і свету. За гады вяшчання на канале сфарміравалася разнастайная вяшчальная сетка, якая на сённяшні дзень уключае рэтрансляцыю фондавых і прэм’ерных запісаў (джаз, фолк, даваенная эстрада, папулярная музыка, радыёверсіі спектакляў і канцэртаў), стварэнне і трансляцыю арыгінальнага радыёкантэнту, заснаванага на сінтэзе розных культур, стыляў, жанраў (літаратурныя радыёсерыялы, паэтычныя радыёкампазіцыі, канцэрты, радыёспектаклі, мастацкае вяшчанне для дзяцей і інш.).

Літаратурныя праекты канала «Культура» прапануюць сучаснаму слухачу творы беларускіх і замежных аўтараў розных гадоў. Найстарэйшай пастановачнай праграмай у жанры «радыёсерыял» з’яўляецца «Літаратурная анталогія». Падобны праект «Радыёбібліятэка» прапануе ўвазе слухачоў фондавыя літаратурныя творы. Для прыхільнікаў паэтычнага слова рыхтуюцца праграмы «Паэтычная раніца», «Паэзія XXI стагоддзя». На канале «Культура» падтрымліваюцца традыцыі айчыннага радыётэатра. Архіўныя і прэм’ерныя літаратурна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

драматычныя работы транслююцца ў праграмах «Радыётэатр плюс» і «Радыётэатр. Лепшае».

Музычнае вяшчанне на канале «Культура» пабудавана пераважна на выкарыстанні фондавых запісаў. Праз супрацоўніцтва з сімфанічным аркестрам і Акадэмічным хорам Белтэлерадыёкампаніі адбываецца папаўненне фондаў сучаснымі музычнымі запісамі. На канале «Культура» арганізаваны рэтрансляцыі канцэртаў, музычных вечароў і спектакляў з тэатраў і канцэртных залаў Беларусі.

Сучаснае дзіцячае радыёвяшчанне ў нашай краіне арганізавана толькі на канале «Культура». У напаўненні штодзённага клуба для дзяцей і падлеткаў «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» (да 2018 г. праграма называлася «Мэры Попінс») выкарыстоўваецца арыгінальны літаратурны кантэнт паводле класічных і твораў сучасных аўтараў. Для маленькіх слухачоў з 2019 г. на канале «Культура» выходзіць «Вячэрняя казка».

Традыцыі мастацкага вяшчання падтрымліваюцца на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё (грамадска-палітычным дзяржаўным радыёканале, які да пачатку 1990-х гг. быў адзіным галоўным каналам эстэтычнага выхавання слухацкай аўдыторыі). У яго эфірнай сетцы маюцца праекты, што прапануюць фондавыя і прэм’ерныя радыёспектаклі («Тэатр Беларускага радыё»), класічную і маладую паэзію («Дабравесце ад паэзіі», «Паэтычны эцюд»), прэм’ерныя музычныя творы («Творчы вечар», «Накцюрны», «Асобы. Жанры. Стылі» [1].

На Беларускім радыё ў нашы дні змяніўся вектар супрацоўніцтва па абмене аўдыяльным кантэнтам. Каналы «Культура» і Першы нацыянальны ўзаемадзейнічаюць з Еўрапейскім вяшчальным саюзам, што дазваляе рэтрансліраваць на нашай тэрыторыі ўнікальныя канцэрты з еўрапейскіх і сусветных канцэртных пляцовак, а таксама прэзентаваць беларускі фальклор і айчынную акадэмічную музыку ў краінах Еўропы.

Вяшчанне каналаў Беларускага радыё арганізавана, у тым ліку, у інтэрнэце, што пашырае прысутнасць мастацкага аўдыякантэнту ў медыяпрасторы краіны. На сайце канала «Культура» функцыянуе архіў з мастацкімі праграмамі.

Для камерцыйных радыёстанцый Беларусі актуальнай застаецца тэма «экалогіі» мастацкага вяшчання. Нягледзячы на па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

велічэнне колькасці падобных паміж сабой станцый, іх «мастацкі» фармат застаецца нязменным – з пераважным выкарыстаннем узораў масавай музычнай культуры – аднак вельмі прыцягальным для сучаснага айчыннага радыёслухача.

Такім чынам, найбольшае эстэтычнае аўдыяльнае ўздзеянне на слухачоў Беларусі было характэрна для радыёвяшчання ў савецкі перыяд, калі эфірная палітыка мэтанакіравана, свядома засноўвалася на папулярызацыі лепшых твораў нацыянальнага і сусветнага мастацтва. Беларускае радыё да сярэдзіны 1950-х гг. заставалася адзінай масавай крыніцай мастацкай асветы і выхавання слухацкай аўдыторыі, што ўплывала на фарміраванне яе ўнутранага свету, напоўненага «эстэтычнымі адценнямі». Са з'яўленнем тэлебачання мастацкі складнік радыё павялічыўся ў аб'ёме і выйшаў на новы, больш дасканалы ўзровень якасці.

Функцыянаванне Беларускага радыё ў наш час з'яўляецца не толькі сведчаннем беражлівых адносін да мастацкіх традыцый радыёвяшчання, але і прыкладам сучаснага, высокатэхналагічнага СМІ, які адпавядае патрабаванням еўрапейскага стандарта ў галіне радыёвяшчання. Беларускае радыё ў сістэме электронных сродкаў масавай інфармацыі займае важную ролю ў эстэтычным выхаванні і фарміраванні мастацкага густу аўдыторыі розных узростаў, паколькі стварае і рэтранслюе ўнікальны мастацкі кантэнт.

---


*1.* Литературно-художественное вещание [Электронный ресурс] // Первый национальный канал Белорусского радио. – Режим доступа: https://radio1.by/ peredachi/literary-and-artistic-broadcasting/. – Дата доступа: 02.11.2019.

*2. Радкевіч, Я. Р.* Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця / Я. Р. Радкевіч. – Мінск : Выд-ва Беларус. дзярж. ун-та, 1983. – 197 с.

*3. Шерель, А. А.* Рампа у микрофона: театр и радио: пути взаимного влияния / А. А. Шерель. – М. : Искусство, 1985. – 301 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ